А. В. Яфімаў

# ПРАВІДЭНЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ У МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ЯК ПРАЕКЦЫЯ АПАФЕНІЧНЫХ УЯЎЛЕННЯЎ

Апафенія – перажыванне, якое выяўляецца ў здольнасці бачыць структуру або ўзаемасувязі ў выпадковых ці бессэнсоўных даных. Азначаны тэрмін з'яўляецца неалагізмам: упершыню ён сустракаецца ў 1958 г. у манаграфіі, прысвечанай даследаванню развіцця шызафрэніі. Аднак пры гэтым апафенія характэрна і для псіхічна здаровых людзей, бо, па сутнасці, здольнасць заўважаць заканамернасці – карысная кагнітыўная функцыя, выпрацаваная ў выніку эвалюцыі. І трэба падкрэсліць, што сёння апафенія разумеецца ў першую чаргу менавіта ў шырокім значэнні [3; 4, с. 119–161; 8; 9]. Больш за тое, ужо вядома прынамсі адно літаратуразнаўчае даследаванне, прысвечанае вывучэнню апафеніі ў мастацкай літаратуры [7].

З навуковага пункту гледжання менавіта апафеніяй тлумачыцца вера ў лёс, наканаванне, фатум і звышнатуральнае ў цэлым: старажытныя людзі заўважылі «доказы» рэальнасці звышнатуральных сіл у асобных супадзеннях і стварылі сістэму магічных прымет і забабонаў. Напрыклад, на памылцы «пасля гэтага – значыць, па прычыне гэтага», верагодней за ўсё, узнік танец шамана для выкліку дажджу [3, с. 332]. Найбольш папулярныя ўяўленні такога кшталту знайшлі выражэнне ў міфалогіі, потым – у фальклоры, нарэшце ў літаратуры. З цягам часу асобныя ўяўленні ўскладняліся і «абрасталі» дадатковымі дэталямі. У дадзеным выпадку можна згадаць шэраг персаніфікацый з антычнай культуры: першапачаткова адна Мойра ператварылася ў трох, з'явіліся асобныя боствы – неабходнасці (Ананка), праўды (Дыка), помсты (Эрыніі) і г. д.

Канцэпцыя монатэізму «замкнула» лёс на Боскім наканаванні, і правідэнцыйны кампанент у літаратуры пачаў страчваць канкрэтнае ўвасабленне. Замест паказу дзеянняў Бога (хоць у некаторых фальклорных творах хрысціянскі Бог выступае як звычайны персанаж) аўтары давалі свае каментарыі адносна адпаведных дзеянняў: «з божай ласкі» – пра нешта добрае, «бог пакараў» – пра нешта кепскае, «бог забраў душу» – пра смерць і г. д.

Літаратуразнаўства, маючы пэўную традыцыю вывучэння асобных правідэнцыйных кампанентаў у помніках прыгожага пісьменства, у дадзеным рэчышчы развівалася пераважна індуктыўна: ад аналізу прыватных прыкладаў да агульных высноў. Аднак сучасныя дасягненні псіхалогіі і неўралогіі

дазваляюць пайсці шляхам дэдукцыі і сфарміраваць агульную тэарэтычную сістэму класіфікацыі даволі разрозненых правідэнцыйных кампанентаў, паколькі маюцца абгрунтаваныя доказы адзінай прыроды паходжання адпаведных уяўленняў, іншымі словамі – агульны крытэрый.

Такім чынам, мы засяродзімся на тых выпадках, калі ў творы няма асобнага выразніка для правідэнцыйнага кампанента, а думка пра наяўнасць звышнатуральных сіл ці нейкай міфічнай сістэмы перадаецца ўскосна і можа быць зразумелай выключна праз апафенічную інтэрпрэтацыю чытача. Прапануем нашу класіфікацыю катэгорый беспрадметнага паказу правідэнцыйных кампанентаў:

1. Знакі са страчанай ці адсутнай матывіроўкай. Прыклады: сонечнае зацьменне ў «Слове пра паход Ігаравы», мёртвы жаўрук у «Знаку бяды».

2. Знакі са зразумелай матывіроўкай. Прыклад рэальнай апафеніі: чалавек лічыў, што выпадкова спынены гадзіннік, а таксама вугал раскрытай шпількі і вугал, утвораны дзвюма ляжачымі паштоўкамі, паведамляе час, у які ягоны сын скончыў жыццё самагубствам (гл. [6]).

3. «Фатальныя выпадковасці».

4. «Рэакцыя». Пасля дзеяння героя адбываецца пэўная падзея, якую трэба разумець як рэакцыю звышнатуральнай сілы. Прыклад: сюжэт з жыція Аўрамія Смаленскага. Калі падчас страшэннай засухі пра дождж малілі крыўдзіцелі Аўрамія, нічога не адбывалася, калі ж памаліўся Аўрамій, пайшоў дождж [2, с. 81–82].

5. «Праклятыя» прадмет, месца, дата, час. Прыклад: першая трагедыя лёсу – п'еса З. Вернера «24 лютага». У адпаведны дзень герой пагражае бацьку нажом і той памірае ад спалоху. Праз шмат гадоў сын героя выпадкова забівае сястру тым жа нажом, пасля чаго збягае з дому. Яшчэ праз некалькі гадоў ён вяртаецца, і герой забівае яго тым самым нажом [5].

6. «Парушэнне правілаў». Герой парушае пэўныя правілы (у тым ліку хрысціянскія запаветы ці народныя/забабонныя традыцыі) і нясе пакаранне. У дадзеным выпадку можна казаць і пра матыў праклёну роду або асобнага чалавека – пры ўмове, што ў мастацкім свеце твора няма магіі як такой і праклён не быў накладзены ўмоўным чараўніком.

7. Справядлівасць. Вера ў сусветную справядлівасць, паводле якой за добрыя ўчынкі чалавек «павінен» атрымаць ад сусвету нейкую ўзнагароду, а за дрэнныя – пакаранне, таксама з'яўляецца праяўленнем апафеніі [1]. І калі ў старажытных фальклорных творах «дабро» перамагае «зло» ў прамой барацьбе, пасля чаго пераможца атрымлівае ўзнагароду, а пераможаны

памірае ці нясе пэўную страту, то ў сучаснай літаратуры нярэдка станоўчыя персанажы робяцца шчаслівымі, а адмоўныя атрымліваюць умоўнае пакаранне ў выніку «збегу акалічнасцей».

Варта асобна адзначыць, што ў старажытных літаратурных помніках апафенічныя кампаненты, хутчэй за ўсё, з'яўляюцца не спецыяльным мастацкім сродкам, а простай фіксацыяй адпаведных уяўленняў, якія існавалі ў рэчаіснасці. З іншага боку, у літаратуры постмадэрнізму апафенічныя кампаненты, наадварот, трэба разглядаць як адмыслова створаныя сэнсаўтваральныя элементы. Больш за тое, можа мець месца і пэўная гульня з чытачом, калі азначаныя кампаненты застаюцца па-за ўвагай персанажаў і прызначаюцца выключна рэцыпіентам тэксту. У той жа час у межах мастацкага твора можа дэманстравацца і «чыстая» апафенія – калі аўтар дакладна дае зразумець, што адпаведныя здагадкі персанажаў насамрэч памылковыя (напрыклад, у кнізе «A Beautiful Mind» Сільвіі Назар; у дадзеным выпадку кніга біяграфічная, аднак нескладана ўявіць цалкам мастацкі твор з падобнай канцэпцыяй). Для стварэння дадатковай інтрыгі аўтары могуць падаваць пэўныя падзеі і з'явы двухсэнсоўна, каб чытач сам вырашаў, ёсць паміж імі містычная сувязь ці не.

Такім чынам, праекцыі апафенічных уяўленняў у помніках беларускай літаратуры XI–XIX стст. заслугоўваюць асобнай увагі, а пошук і вывучэнне адпаведных элементаў могуць лічыцца перспектыўным напрамкам літаратуразнаўчай дзейнасці, які дазволіць выразна акрэсліць аб'ектыўна існуючую агульнасць правідэнцыйных кампанентаў і пасадзейнічае больш глыбокаму разуменню асобных твораў.

## Літаратура

1. *Матфатов, О.* Полная апофения: почему мы видим смысл в бессмысленных вещах [Электронны рэсурс] / О. Матфатов // НОЖ: Интеллектуальный журнал о культуре и обществе. – Рэжым доступу: https://knife.media/apophenia/. – Дата доступу: 02.04.2019.

2. Месяца августа в 21 день. Житие и терпение преподобного отца нашего Авраамия архимандрида, просветившаго в терпении мнозе и новаго града во святых Смоленскаго // Кніга жыцій і хаджэнняў: пер. са старажытнарус., старабеларус. і польск. / уклад., прадм. і каментарыі А. Мельнікава. Мінск, 1994. – 503 с.

3. *Непряхин, Н.* Я манипулирую тобой: Методы противодействия скрытому влиянию / Н. Непряхин. – Москва: Альпина Паблишер, 2018. – 376 с.

4. *Панчин, А. Ю.* Защита от темных искусств: путеводитель по миру паранормальных явлений / А. Ю. Панчин. – Москва: АСТ, Corpus, 2018. – 400 с.

5. Трагедия рока [Электронны рэсурс] // Путь к осознанности. – Рэжым доступу: https://www.litdic.ru/tragediya-roka/. – Дата доступу: 02.04.2019.

6. Apophenia [Электронны рэсурс] // The Skeptic's dictionary. – Рэжым доступу: http://skepdic.com/apophenia.html. – Дата доступу: 02.04.2019.

7. *Barban, L.* Apophenia: The postmodern trap in Auster's fictions [Электронны рэсурс] / L. Barban // Università Ca'Foscari Venezia online. Archivio istituzionale ad accesso aperto. – Рэжым доступу: http://dspace.unive.it/handle/10579/8905?show=full. – Дата доступу: 02.04.2019.

8. *Dennett, D. C.* Breaking the spell. Religion as a natural phenomenon / D. C. Dennett. – London: Penguin Books, 2007. – 464 p.

9. *Hubscher, S. L.* Apophenia: definition and analysis [Electronic resource] / S. L. Hubscher // Digital bits skeptic. – Mode of access: https://archive.is/20130121151738/http://www.dbskeptic.com/2007/11/04/apophenia-definition-and-analysis/#selection-367.0–437.178. – Date of access: 02.04.2019.